# Старажытныя вераванні і погляды, мастацтва. Язычніцтва

## Урок гісторыі Беларусі, X клас

**С. В. Багалейша**, кандыдат гістарычных навук,
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства СШ № 125 г. Мінска

**Задачы:**

- сфарміраваць у вучняў прадстаўленне аб старажытных вераваннях і поглядах першабытных людзей, пазнаёміць іх з паняццем *язычніцтва*;
- сфарміраваць у вучняў навыкі самастойнай працы па вывучэнні народнага календара Беларусі;
- выхоўваць любоў і павагу да беларускіх народных традыцый.

Вучні павінны **ведаць:**

- вытокі рэлігійных уяўленняў;
- асноўныя паняцці: *татэмізм, анімізм, фетышызм, магія, курганы, арнамент, салярная арнаментыка, «лунніцы»;*
- язычніцкія вераванні;
- звычаі і абрады старажытнага насельніцтва Беларусі. Пахавальны абрад;
- асноўныя дасягненні ў развіцці мастацтва;
- захаванне язычніцтва да сучаснага часу.

Вучні павінны **ўмець:**

- аналізаваць, абагульняць, параўноўваць, тлумачыць гістарычныя факты на аснове шматбаковага вывучэння крыніц;
- суадносіць гістарычныя падзеі з перыядам і эпохай;
- тлумачыць асноўныя заканамернасці і асаблівасці гістарычнага развіцця;
- правільна размяркоўваць час для выканання задання;
- ацэньваць працу сваю і таварышаў;
- рыхтаваць паведамленні.

**План**

1. Вытокі рэлігійных уяўленняў.
2. Першабытнае мастацтва.
3. Язычніцкія вераванні ўсходніх славян.

**Апераджальнае заданне:** падрыхтуйце паведамленні на тэмы: «Каляды», «Купалле», «Дзяды».

**Тып урока:** камбінаваны.

**Забеспячэнне ўрока:** на дошцы запісаны тэма і план урока, гістарычныя паняцці.

**Асноўныя гістарычныя паняцці**

***Анімізм*** — вера ў існаванне душ і духаў.

***Курганы*** — насып над магілай.

***Пантэон*** — сукупнасць усіх багоў таго ці іншага культу.

***Татэмізм*** — сукупнасць фантастычных уяўленняў, звычаяў і абрадаў, заснаваных на веры ў звышнатуральную роднасць паміж групай людзей і так званым татэмам — пэўным відам жывёл, раслін.

***Фетышызм*** — культ неадушаўлёных прадметаў, надзеленых звышнатуральнымі ўласцівасцямі.

***Язычніцкія вераванні*** — старадаўнія вераванні і культуры, што існавалі да ўзнікнення трох сусветных рэлігій.



gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

## Ход урока

*I. Арганізацыйны момант.*

*II. Праверка дамашняга задання (вуснае апытанне).*

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце асноўныя археалагічныя культуры жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.

2. Вызначце храналагічныя рамкі жалезнага веку.

3. Якім чынам на Беларусі здабывалі жалеза?

4. Якія тыпы паселішчаў і чаму былі распаўсюджаны ў Беларусі ў III—V стст.?

5. Чаму многія вучоныя лічаць плямёны культур штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай балцкімі?

6. Які матэрыял выкарыстоўваўся для вытворчасці прылад працы?

*III. Актуалізацыя матэрыялу.*

**Настаўнік.** Успомніце і дайце вызначэнне паняццям: *рэлігія, царква.* Якія прычыны ўзнікнення рэлігійных вераванняў вы ведаеце? Як называліся вераванні, якія існавалі на беларускіх землях да прыняцця хрысціянства?

*IV. Выкладанне новага матэрыялу.*

— Жыццё першабытных людзей праходзіла ў жорсткай барацьбе за існаванне. Старажытнаму чалавеку не хапала ведаў і вопыту, каб зразумець і растлумачыць навакольны свет. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў такіх ранніх відах рэлігійных уяўленняў, як татэмізм, анімізм, фетышызм, магія. Паступова людзі пачынаюць верыць у мноства багоў і ствараюць свой пантэон. Рэлігійныя вераванні ў балтаў і славян, як і ў іншых старажытных народаў, былі язычніцкія. Нашы продкі ўшаноўвалі агонь, сонца, месяц, зоркі, гром, птушак, жывёл. Старажытныя жыхары Беларусі ўяўлялі, што дрэвы, камяні, ручаі, рэкі, азёры — гэта жывыя істоты і пакланяліся ім. Язычніцтва мела глыбокія карані на беларускіх землях.

Вучні запісваюць у сшытак асноўныя паняцці.

— Важнае месца ў першабытных людзей займалі розныя абрады і культы (у першую чаргу — шанаванне розных сіл прыроды). Існавалі культ агню, сонца, каня, продкаў. Важнае месца адводзілася пахавальнаму абраду. Ён быў звязаны з верай чалавека ў замагільнае жыццё. Існавалі два асноўныя віды пахавання памерлых: трупапалажэнне і трупаспаленне. Часта над нябожчыкамі насыпалі курганы. Самы старажытны з іх знаходзіцца каля вёскі Ходасавічы на Гомельшчыне. Першабытныя вераванні сталі асновай, на якой сфарміравалася язычніцкая рэлігія.

— Вызначце асноўныя асаблівасці развіцця першабытнага грамадства (с. 25—24). *(Адказы.)*

— Самыя старажытныя ўзоры мастацтва на тэрыторыі Беларусі маюць узрост 20—25 тыс. гадоў (позні палеаліт). Яны ўпрыгожваліся арнаментам — узорам, заснаваным на паўторы і чаргаванні элементаў, якія яго складалі. Ён выкарыстоўваўся для ўпрыгожвання розных рэчаў. Жаночыя падвескі нагадвалі серп і таму атрымалі назву «лунніцы».

— Язычніцтва пачалося ад культу продкаў і закончылася складаным разгорнутым пантэонам багоў. Язычніцтва — умоўны тэрмін, які абазначае старажытныя вераванні і культы. Узнікла ад царкоўнаславянскага слова «язычы», пад якім, згодна з Новым Запаветам Бібліі, разумеліся народы, проціпастаўленыя першым хрысціянскім абшчынам.

**Пантэон багоў усходніх славян**

*Пярун* бог грому і маланкі.

*Сварог* — бог неба.

*Хорс* — бог сонца.

*Дажбог* — бог сонечнага святла.

*Стрыбог* — бог ветроў.

*Мокаш* — жаночае бажаство ўрадлівасці і хатняга ачага.

*Волас* — бог жывёлагадоўлі.

*Лада* — багіня вясны, апякунка шлюбу і сям'і.

— Прывядзіце прыклады спалучэння хрысціянства і язычніцкіх вераванняў

gisdapamoga.by

у народнай самасвядомасці, традыцыях і абрадах.

Вучні выступаюць з паведамленнямі, якія затым абмяркоўваюцца.

***V. Замацаванне новага матэрыялу. Выхадны кантроль.***

Тэст

**1. Усходнія славяне былі хрышчаны:**
а) у X ст.; б) XI ст.; в) XII ст.

**2. Да прыняцця хрысціянства ўсходнія славяне былі:**

а) будыстамі; б) мусульманамі; в) язычнікамі.

**3. Епархія ў Тураве была заснавана:**
а) у 905 г.; б) 1005 г.; в) 1105 г.

**4. Асноўнымі прычынамі прыняцця хрысціянства былі:**

а) патрэбнасць у сусветнай рэлігіі;

б) неабходнасць апраўдання няроўнасці з прычыны ўзнікнення дзяржавы;

в) патрэбнасць у ведах, пісьменнасці;

г) неабходнасць цесных сувязей з іншымі хрысціянскімі дзяржавамі;

д) патрэбнасць верыць у аднаго бога.

**5. Прычынамі хуткай перамогі хрысціянства былі:**

а) цікавасць да новай веры;

б) крах старой язычніцкай веры, якая не адпавядала інтарэсам класавага грамадства;

в) зацікаўленасць у новай веры пануючых вярхоў;

г) маральна-этычны характар хрысціянства;

д) інтэрнацыянальны і ўсесаслоўны характар хрысціянства;

е) ідэйная і арганізуючая роля Царквы Хрыстовай.

**6. Назавіце асаблівасці прыняцця хрысціянства на Беларусі:**

а) распаўсюджвалася паступова, пераважна негвалтоўнымі метадамі;

б) прынялі пануючыя вярхі;

в) доўгі час існавала двухвер'е;

г) існавала талерантнасць.

**7. Першай жанчынай, прылічанай да ліку святых, была:**

а) Вольга; б) Ефрасіння Полацкая; в) Рагнеда.

***VI. Рэфлексія. Самаацэнка.***

— Што новага вы даведаліся на ўроку? Што не зусім зразумелі? Ці спадабаўся вам урок? *(Адказы.)*

***VII. Дамашняе заданне.*** § 9. Пытанні 1—6. Падрыхтуйце паведамленні: «Вусная народная творчасць», «Дзейнасць братоў Кірыла і Мяфодзія».

# Беларусь в середине XVI — первой половине XVII века

## История Беларуси, VIII класс

**Г. Э. Давидовская**, учитель истории гимназии № 21 г. Минска

**Цели:** организация познавательной деятельности учащихся по повторению и обобщению темы «Беларусь в середине XVI — первой половине XVII в.»; создание условий для выявления и ликвидации пробелов в знаниях; подготовка к тематическому контролю.

**Задачи**

1. Развивать умения учащихся применять на практике полученные знания.
2. Обеспечить закрепление основных понятий темы, организовать их применение на практике.

gisdapamoga.by